# Школьная планета

НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 6 (26) Люты 2016

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*

**СПЕЦВЫПУСК**

## ЯК ЗВЫЧАЙНА, ЛЮТЫ АБ’ЯЎЛЕНЫ МЕСЯЧНІКАМ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

### Патрыятызм – адна з асноўных састаўляючых беларускай дзяржаўнай ідэі

*Пытанні грамадзянскасці, патрыятызму заўсёды былі асабліва значнымі не толькі ў духоўным жыцці нашага грамадства, але і ва ўсіх важнейшых сферах яго дзейнасці – ідэалогіі, палітыкі, культуры, эканомікі, экалогіі. Змест і накіраванасць грамадзянска-патрыятычнага выхавання заўсёды вызначаліся перш за ўсё духоўным і маральным кліматам грамадства, гістарычнымі працэсамі, якія напаўнялі жыццё пакаленняў. Народ, у якога не сфарміравана пачуццё патрыятызму, – варвар і вандал. Ён не толькі не здольны любіць, разумець і паважаць другіх людзей і іх краіны, традыцыі і духоўныя каштоўнасці, але і асуджаны на забыццё і знікненне з гістарычнай арэны. Неабходна пастаянна памятаць, што патрыятызм – адна з асноўных састаўляючых беларускай дзяржаўнай ідэі. Памяць аб ратных справах беларусаў у гады ваенных іспытаў з’яўляецца ва ўсведамленні нашага народа шчытом і перашкодай ад розных спробаў фальсіфікацыі гісторыі краіны, прыніжэння нацыянальнай годнасці.*

*Захаванне і пастаянная трансляцыя гістарычнага вопыту беларускага народа, а таксама пераканаўчы паказ яго шматлікіх дасягненняў сёння – асноўныя формы ідэалагічнага выхавання падрастаючага пакалення. А значыць, павінна павышацца роля і ўзмацняцца адказнасць кожнага чалавека і калектыву, які ўдзельнічае ў працэсе выхавання. Ад таго, наколькі правільна мы разумеем ідэалы і сутнасць гэтай дзейнасці, будзе залежаць эфектыўнасць і якасць рашэння задач ва ўсіх астатніх сферах нашага жыцця.*

**Дом, у якім утульна ўсім!**

**berezino2.school.by** **vk.com/club59543714** ***№ 26, люты 2016 г.***

***СПЕЦВЫПУСК***




# 15 лютага – Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў

***Гэта не свята... Гэта дзень памяці. Гэта дзень тых, хто загінуў за жыццё сваіх сяброў-аднапалчан, за свабоду. У гэты дзень многія вярнуліся дадому да маці, бацькі, каханай. Але вярнуліся яны часткова, бо частка іх душы засталася там, на вайне, з загінуўшымі хлопцамі.***





15 лютага 2016 года дзверы нашай школы былі адчынены для воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія пражываюць у горадзе Беразіно і Бярэзінскім раёне. Зразумела, мы не маглі не сустрэцца з імі і не пагутарыць. Мы стараліся задаваць ім такія пытанні, якія не закранулі б нядаўна загоеныя раны ўспамінаў. І, як і варта было чакаць, многія адказы былі аднолькавымі, а некаторыя і зусім не хацелі гаварыць, а казалі толькі слова «балюча»...

На пытанне: «Як і пры якіх абставінах вы патрапілі ў Афганістан?», многія адказвалі, што траплялі ў Афганістан адразу з арміі. А ім жа было ўсяго 19-20 гадоў...

Слова «вайна» у іх асацыіруецца з болем, страхам, пакутамі, перажываннямі... Гэтыя людзі проста найбольш адчувальныя.

Я задалася пытаннем, якія ж моманты ім найбольш запомніліся, але многія адмаўляліся адказваць, казалі, што многае проста не хочацца ўспамінаць, што многае забыта... *(Заканчэнне на 3 старонцы)*

*Дом, у якім утульна ўсім!*

**berezino2.school.by** **vk.com/club59543714** ***№ 26, люты 2016 г.***

***СПЕЦВЫПУСК***

*(Заканчэнне. Пачатак на 2 старонцы)*



Яны засяроджвалі сваю ўвагу менавіта на гарах: «Горы…так, там прыгожыя горы…» (і погляд у бясконцасць, у памяць пры гэтым слове).



А мы ведаем: ніхто не забыты, нішто не забыта. Так, станоўчых момантаў было мала. Адзінае, што можна вылучыць, гэта – пейзаж тых мясцовасцяў, дзе ім давялося пабываць. Гэта горы, пустыня, «зялёнка» (на вайсковым жаргоне гэта лясістая мясцовасць, густыя зараснікі).

Купіч Алег Леанідавіч (старшыня Бярэзінскай раённай арганізацыі "Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане") на пытанне «А вы вярнуліся б туды зноў?» адказаў: «Вярнуўся б, але не для вайны, а для таварышаў…». Дарэчы сказаць, Алег Леанідавіч накіраваўся добра-ахвотнікам ў Афганістан.



***У вайны не жаночы твар…***

***Так, цалкам згодна. Цяжка было глядзець на дарослых мужчын са скупымі слязьмі на вачах… Дык давайце ж не будзем забываць тыя страшныя дні хаця б для таго, каб не паўтараць тых памылак!..***

*Власюк Марыя*

**_Дом, у якім утульна ўсім!_**

**berezino2.school.by vk.com/club59543714** ***№ 26, люты 2016 г.***

***СПЕЦВЫПУСК***

# ***На вайне не думаюць аб смерці. Там людзі думаюць пра жыццё. І ў гэтым іх моц…***

***Гісторыю не павярнуць назад. Песні пра Афганістан пісалі 20-гадовыя юнакі. Усе тыя пачуцці, якія яны ўклалі ў радкі песень, вершаў трэба разумець, трэба памятаць... Гэтыя песні мала проста слухаць.***





Вайна ў Афганістане – сумны ўспамін для ўсіх. Шмат людзей загінула, многія прапалі без вестак. Нам цяжка зразумець боль страты бацькі, мужа, сына, якую перажылі іх блізкія. За што яны загінулі? Яны пайшлі на гэтую вайну, ведаючы, што могуць не вярнуцца. Мы заўсёды будзем памятаць іх учынак. Усе яны сталі героямі. Цяпер яны ідуць, ззяючы бляскам ордэнаў. Многія з іх кажуць: «Няхай часы былі жудаснымі, але менавіта там мы даведаліся, што такое сапраўднае сяброўства, што значыць прыкрыць сваім целам таварыша».

***Гурын Андрэй Іванавіч:***

- Я пайшоў у Афганістан яшчэ хлопцам, і я ўявіць сабе не мог, колькі болю можа прынесці вайна. Я знайшоў шмат добрых сяброў, але, на жаль, некаторых страціў. Скажу проста: няма той мясціны і таго чалавека, да якога вайна была б справядлівая...

***Санкевіч Аляксандр Анатольевіч:***

- Як і многіх “афганцаў”, спачатку мяне проста прызвалі ў армію, дзе я год служыў на мяжы. Потым мяне накіравалі ў Афганістан. Зразумела, вайна – гэта дрэнна, і нічога добрага яна не дае, але менавіта там я адчуў, што такое сапраўднае сяброўства.

***Лапыцька Станіслаў Васільевіч:***

- На службу ў Афганістан я пайшоў добраахвотна. Я не магу сказаць дакладна, чаму я вырашыў гэта зрабіць. Я лічу, што не існуе такога слова, якое змагло б перадаць усё, што звязана з вайной. Нягледзячы на ўсе цяжкасці вайны, у мяне з’явілася шмат сяброў з Расіі, з Афганістана, з якімі я падтрымліваю адносіны і зараз.



*Дудко Аляксандра, Гурэнчык Ксенія*

СПЕЦВЫПУСК

## Сардэчна віншуем
## з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь!

***Кожны, чыёй справай жыццяя стала абарона нашай роднай краіны, заслугоўвае самых цёплых, шчырых слоў удзячнасці за сваю працу. Мы, беларусы, па праву можам ганарыцца абаронцамі нашай Айчыны.***

***Мы аддаём даніну павагі і выказваем словы падзякі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны за подзвіг і мужнасць, праяўленыя ў гады суровых выпрабаванняў.***

***Жадаем усім, хто ў любы момант гатовы абараняць родную Беларусь, шчасця, здароўя і поспехаў ва ўсіх пачынаннях.***










*Дом, у якім утульна ўсім!*
berezino2.school.by vk.com/club59543714 *№ 26, люты 2016 г.*
***СПЕЦВЫПУСК***

# *АКЦИЯ “ДРУЖИМ С ЗАКОНОМ!”*

С 10 по 25 февраля 2016 года прошла межведомственная профилактическая акции «Дружим с законом!». Акция проводилась с целью формирования у учащихся осознанного законопослушного поведения, привития им духовных и нравственных ценностей, стремления к здоровому образу жизни.

Круглый стол
«Подросток и закон»










Конкурс рисунков
«Подружись со спортом!»



Тематический диспут
«Уголовная ответственность несовершеннолетних»





СПЕЦВЫПУСК



## Спортивный праздник «Здоровый учитель - здоровый ученик»







## Встреча-диалог со священником Иоанном Шибеком «Христианский взгляд на проблему зависимостей»





Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 26, люты 2016 г.
СПЕЦВЫПУСК

# “А НУ-КА, ПАПЫ!”












ДУА “Сярэдняя школа № 2
горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета”
выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба
“Юны журналіст”: Галуза
Яўгенія, Цэнкель Алена,
Вайцяховіч Лізавета,
Гурэнчык Ксенія, Власюк
Марыя, Маркевіч Ірына